# РЫБЫ

**Раскажыце**, дзе вы бачылі рыб. Што вы пра іх ведаеце? Што хочаце даведацца?

Рыбы жывуць у акіянах і морах, рэках і азёрах, балотах і ручаях. Самая буйная рыба ў Беларусі — рачны сом. Ён дасягае ў даўжыню 5 метраў. Самая вялікая марская рыба — кітовая акула. Яе даўжыня большая за ваш клас — 18 метраў! А важыць яна, як 6 сланоў!

**Разгледзьце** малюнкі. **Назавіце** рыб, якія жывуць у Беларусі. Як адрозніць рыб ад іншых жыхароў вадаёмаў?



Рыбы — жывёлы, якія жывуць у вадзе, іх цела пакрыта луской. У целе рыб адрозніваюць галаву, тулава і хвост. Канечнасці гэтых жывёл — плаўнікі.




**Абмяркуйце**, чаму рыбы могуць жыць у вадзе. Што ім дапамагае ў гэтым?

Цела рыб мае абцякальную форму. Галава плаўна пераходзіць у тулава, а тулава — у хвост. Гэта дазваляе рыбе лёгка рассякаць ваду.






Правообладатель Академия образования

Цела рыб пакрыта луской і сліззю. Краі лускавінак налягаюць адзін на другі, як чарапіца на даху. Гэта аблягчае плаванне. Плаваюць рыбы з дапамогай плаўнікоў і хваста. Дыхаць раствораным у вадзе кіслародам ім дапамагаюць жабры, прыкрытыя жабравымі крышкамі.

? **Пакажыце** на с. 82—83 рыб розных груп па спосабе харчавання з апорай на табліцу.

| Раслінnаедныя | Драпежныя | Усёедныя |
| --- | --- | --- |
| Белы амур<br>Таўсталобік | Акунь<br>Сом<br>Шчупак<br>Лешч | Карась<br>Плотка<br>Красна-<br>пёрка |

Рыбы іграюць вялікую ролю ў прыродзе. Паядаючы водныя расліны, яны перашкаджаюць зарастанню вадаёмаў. Драпежныя і ўсёедныя рыбы палююць на водных насякомых, рачкоў, чарвякоў, іншых рыб. Многія рыбы самі служаць здабычай для жаб, птушак, звяроў.

**Паназірайце** за рыбкамі ў акварыуме (дома, у школе, зоамагазіне). Як яны плаваюць? Як варушаць плаўнікамі? Чым харчуюцца? Як хапа́юць корм?

## Праверце сябе

1. Як вы адрозніце рыб ад іншых жывёл? Што новага вы даведаліся пра рыб?
2. Дакажыце, што рыбы добра прыстасаваны да жыцця ў вадзе.
3. Прывядзіце прыклады раслiннаедных, драпежных і ўсёедных рыб.

## Пытанні юным знаўцам

*1. Чаму жывую рыбу цяжка ўтрымаць у руках?

*2. Навошта ў акварыум з рыбкамі запампоўваюць паветра? с. 16

С. 131—139. Як па лусцэ даведацца пра ўзрост рыбы?

Н. И. Сладков «Рыбы»; М. Е. Аспиз «Чемпионы по плаванию»; В. П. Дацкевич «Цветные плавнички».



Правообладатель Академия образования